17. *Смирнов А.А.* Детские рисунки // Хрестоматия по возрастной и педагогической психологии / Под ред. И.И.Ильясова и В.Я.Ляудис. — М., 1980.

18. *Спасский С.* Православное учение о почитании святых икон. — М., 1995.

19. *Трубецкой Е.Н.* Три очерка о русской иконе. — М., 1981.

20. *Успенский Л.А.* Богословие иконы православной церкви. — М., 1989.

21. *Флоренский П.* Иконостас // Философия русского религиозного искусства. XV—XX вв. — М., 1993.

22. *Шенборн К.* Икона Христа. Богословские основы. — Милан; М., 1999.

23. *Богословие* иконы. — М., 1994.

**Н.Д.Піскун,**
*выкладчык*

# ВОБРАЗ КАЗЫ Ў ВЕРАВАННЯХ, ПАРАТЭАТРАЛЬНЫХ ДЗЕЯХ І НАРОДНЫМ ТЭАТРЫ БЕЛАРУСАЎ

Персанажы ў народным тэатры беларусаў можна разглядаць з розных пунктаў гледжання: характару, ролі, становішча, алегорыі і інш. Аднак цікавым уяўляецца даследаванне вобраза з пункту гледжання яго эвалюцыі. Бясспрэчны той факт, што шматлікія персанажы фальклорнага тэатра архетыповыя. Іх "гісторыя" бярэ свой пачатак у старажытных вераваннях людзей і на працягу стагоддзяў трансфармуецца і асімілюецца ў розных культурах, у розных відах народнай творчасці. Прычым, калі праобраз архетыпа існуе ў першасным матыве або сюжэце, то на працягу ўсяго перыяду сваёй эвалюцыі ён можа набыць нацыянальную афарбоўку, змяніцца па сваіх знешніх прыметах (касцюмах, атрыбутах, мове і г. д.), несучы ў сабе пры гэтым першапачаткова набытыя рысы вобраза і дакладнасць сітуацый, у якіх ён дзейнічае. Адным з такіх вобразаў у народным тэатры беларусаў з'яўляецца "танцуючая" і "спяваючая" Каза. Звернемся да гісторыі ўзнікнення і эвалюцыі гэтага вобраза ў агульнакультурным маштабе.

Міфалагічная гісторыя Казы пачынаецца з палеалітычнага жывапісу (сюжэт тыпу "Казёл каля дрэва"). У эпоху мезаліту

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбываецца адамашніванне жывёл, што пацвярджае выява казляняці, знойдзеная ў палацы Саргона II у Дуршарукіне. Пераход першабытнага чалавека ад палявання да земляробства і жывёлагадоўлі выклікаў псраасэнсаванне архаічных уяўленняў і вобразаў. Дзікія звсры пачалі замяняцца хатнімі, якія трансфармаваліся ў сімвалы ўрадлівасці. З вобразам Казла як сімвала ўрадлівасці звязаны і іншыя міфалагічныя персанажы — літоўскі Пяркунас, славянскі Пярун, скандынаўскі Тор і інш. Існуе версія аб тым, што каза была першай прыручанай жывёлай у Грэцыі. Гэта пацвярджаюць знаходкі ў Шрыхоне (VII ст. да н. э.). Яе малако дазваляла выжываць людзям у засушлівых абласцях. Таму ў антычных міфах каза карыстаецца павагай як карміцелька (каза Амалфея выкарміла Зеўса-дзіця). Лічылася, што шкура гэтай казы была пастаянным атрыбутам Зеўса, Афіны, часам Апалона. З рога Амалфеі Зеўс зрабіў "рог дастатку". Дзікая каза заўсёды была спадарожніцай Артэміды. Існавалі таксама ўяўленні аб Казе як сімвале хмары, якая хавае маланкі Зеўса, і індаеўрапейскім вобразе Казла як заморфным сімвале маланкі і грому. У міфе гаворыцца, што ў казляня быў ператвораны Дыяніс, пабочны сын Зеўса. Зеўс быў вымушаны зрабіць гэтае пераўтварэнне, каб выратаваць Дыяніса ад рэўнасці Геры.

У прысвечаных Дыянісу кульце і містэрыях галоўным момантам было ахвярапрынашэнне і паяданне казла (або быка). Кульмінацыяй абраду лічылася цырымонія прычасці, далучэння да цела бога, якога сімвалічна замяняла казляня. У час вакханалій у гонар Дыяніса жанчыны раздзіралі ахвярных жывёл і прычашчаліся кроў'ю і целам бога. На святах Дыяніса суправаджалі спадарожнікі — сатыры ў казліных шкурах. Сатыры былі "пакрыты шэрсцю, доўгавалосыя, барадатыя, з капытамі (казлінымі ці конскімі хвастамі, з рожкамі <...> аднак торс і галава ў іх чалавечыя".

Непасрэдныя адносіны да Дыяніса маюць трагедыі ў Старажытнай Грэцыі, дзе яны ўзніклі з лірычнай паэзіі і дыфірамбаў. Арыён арганізаваў хор з сатыраў (іх называлі казламі), якія суправаджалі Дыяніса, адсюль і з'явілася назва "трагедыя", што значыць "спевы казлоў". У свіце Дыяніса быў таксама бог Пан. Першапачаткова ён меў воблік казла, затым верхняя частка яго цела стала чалавечай, а ў больш позніх выявах аб яго жывёльным паходжанні нагадвалі толькі маленькія рожкі на галаве. Пасля таго як Пан страціў традыцыйныя рысы, на выявах побач з ім сталі змяшчаць казляня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З узнікненнем і распаўсюджаннем хрысціянства адбываецца раздзяленне вобразаў Казы і Казла. Калі першая ўпамінаецца ў "Бестыярыі" наступным чынам: "Як каза, любіць і Хрыстос высокія горы, якія ёсць праркі і апосталы", — то Казёл становіцца "ванючай, грознай, пастаянна шукаючай задавальнення" істотай, якая на Страшным судзе асуджаецца на вечнае пакаранне ў пекле. Гэтае ўяўленне зрабілася такім ўстойлівым, што саму нячыстую сілу і Сатану сталі маляваць у вобразе Казла. У адмоўных адносінах да Казла адыграў сваю ролю біблейскі звычай перанясення віны людзей на "казла адпушчэння". У сярэдневяковай Еўропе казла лічылі дэманічнай жывёлай, атрыбутам вядзьмарак і чараўнікоў. Непрыманню гэтай жывёлы садзейнічалі прадстаўленні ніжэйшага віду відовішчнага мастацтва — буфоны, якія прымушалі казлоў паказваць майстэрскія скачкі, арганізоўвалі паядынкі коз і казлоў, дэманстравалі казліныя "танцы". Лічылася, што злыя духі вельмі вынаходлівыя і горача любяць музыку. Чэрці-музыкі прымалі розныя абліччы, у тым ліку і казла (на рэльефе з Нотр-Дама дэ ля Рэгль ён іграе на арфе; на капітэлі цэнтральнага слупа Кентэрберы казел-флейтыст асядлаў дракона).

У славянскай міфалогіі казёл спакон вякоў быў сімвалам урадлівасці. Дзякуючы сваёй пладавітасці і сексуальнасці ён з'яўляўся пастаянным удзельнікам шматлікіх абрадаў, накіраваных на ажыўленне жыватворчых сіл зямлі. Ён з'яўляўся адной з самых старадаўніх ахвярных жывёл. Як падкрэслівае В.Шуклін, "казёл заўсёды адносіўся да чыстых жывёл, здольных адганяць шкодныя сілы. Яго шэрсць выкарыстоўвалі як талісаман ад насылаемых ведзьмакамі чараў, хвароб. Лічылася, што ружэйны зарад з шэрсцю казла можа ўбіць ваўкалака", а таксама "вадзяніка можна ўлагодзіць шэрсцю чорнага казла". У некаторых народаў, у тым ліку і беларусаў, існавала ахвярапрынашэнне казла ў час пахавальнага абраду і памінак па нябожчыках. Казёл павінен быў служыць ежай нябожчыку, якая дапамагла б яму адрадзіцца. Па апісанні А.К.Кіркора, ахвярапрынашэнне казла ў мястэчку Гняздзілава Дзісенскага павета выглядала наступным чынам: "... у храмавое свята, 29 чэрвеня, збіралася мноства народу з навакольных мясцін і рабілі асобага роду памінкі па памерлых. Хто толькі меў магчымасць, прыводзіў з сабою казу; коз гэтых урачыста рэзалі, смажылі і з'ядалі на могілках, на магілах родных і сяброў". Каза ж у славянскай міфалогіі была сімвалам маланкі. Па паданнях, у казу ператвараецца Каляда



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(маці Сонца, жонка Перуна), якая ўцякае ад Карачуна (Сітыўрата, Чарнабога). Яна хаваецца ў лазняку і там нараджае Дажбога. Тут яўна прасочваецца архетыповая сувязь са старажытнагрэчаскім міфам аб Амалфеі, якая выкарміла Зеўса-дзіця.

Бясспрэчна, заканамерны той факт, што Каза з'яўляецца адным з персанажаў у славянскіх казках, легендах, загадках і інш. Аднак і тут адносіны да яе дваякія. Пасля таго як каза стала адной са звычайных дамашніх жывёл, у адносінах да яе знікла шанаванне як да сакральнай жывёлы, але разам з тым водгаласы язычніцкіх вераванняў яшчэ доўга знаходзілі сваё адлюстраванне ў народнай творчасці. Прыкладам можа служыць казка пра Алёнку і яе брата Іванку. У гэтай казцы прасочваецца матыў ахвярапрынашэння. Задуманае забойства абстаўляецца згодна рытуалу: “Агні гараць гаручыя, катлы кіпяць кіпучыя, точаць нажы булатныя, хочуць казла зарэзаць...” Адсюль, верагодна, пайшлі выказванні “забіваць казла”, “драць казу”, драць, як сідараву казу”. Каза, як сутачны сімвал раніцы, дня, вечара і ночы, прысутнічае ў казцы “Каза Дарота”. Вядомы вобраз Казы-залатыя рогі, якая гуляе ў запаведных лясах, спявае песні і расказвае казкі. Як негатыўны персанаж успрымаецца вобраз Казы лупленай. Таксама Каза ўвасабляла ўпартасць, глупства, шкадлівасць. Сеючая разлад Каза-дзераза збліжаецца з раслінай (дзераза), якую выкарыстоўвалі чараўнікі, каб выклікаць варожасць паміж людзьмі. У народнай дэманалогіі чорны казёл таксама звязваўся з “ніжнім светам”, што адлюстравалася ў казках, дзе д'ябал старшынстваваў на шабасах у абліччы чорнага казла.

Каза з'яўляецца адным з галоўных персанажаў песеннай творчасці беларусаў. Яна прысутнічае ў зімовым і вясновым каляндарна-абрадавых цыклах песеннага фальклору, дзе паранейшаму выступае сімвалам урадлівасці. Асобнае месца займае яе вобраз у народных песнях для дзяцей (напрыклад, у такіх як “Як у бабулі казёл”, “Як пайшоў казёл дарогаю”, “А шэрая козанька”, “Ішоў казёл мастом”, “Пайшла каза ў арэхі” і інш.).

Казе пашчасціла стаць адным з галоўных персанажаў калядных абходаў, у час якіх спяваліся гульнявыя і карагодныя песні, наладжваліся ігрышчы і паратэатральныя паказы. На працягу ўсяго двухтыднёвага каляднага перыяду (у католікаў з 25 снежня, у праваслаўных з 7 студзеня) з яго святымі (не працоўнымі) вечарамі доўжылася свята, якое суправаджалася смехам і весялосцю. У відовішчах, якія наладжвалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пераапранутыя, на першым плане — рытуальнае ваджэнне "казца" ("казла"), якое адбывалася непасрэдна ў дні калядавання. Яго ядро складае каляндарная песня "Го-го-го, каза", першапачатковы сэнс выканання якой заключаўся ў садзейнічанні паляпшэнню ўраджаю. Гурт калядоўшчыкаў уводзіў у хату Казу і зацягваў песню, магічны сэнс якой пацвярджаўся зместам: "Дзе каза рогам, Там жыта стогам. Дзе каза нагой, Там жыта капой. Дзе каза хвастом, Там жыта кустом..." У гэтай песні прысутнічае старажытны язычніцкі матыў ахвярапрынашэння, а іменна "ўпамінанне пра старога дзеда, які збіраецца загубіць казу. Гэты дзед у чымсьці падобны на язычніцкага жраца; у такім выпадку ў казе можна бачыць ахвярнае". У час спеваў Каза нязграбна паварочвалася з боку ў бок, у адпаведных месцах песні прытопвала нагамі, прыстуквала рагамі, кланялася і ... падала як нежывая, а ў канцы імгненна аджывала і ўскоквала на ногі. Рухі Казы былі выразна камічнымі і выклікалі смех у прысутных. З цягам часу гэты абрад згубіў свой магічны сэнс і ператварыўся ў вясёлы і смешны карнавал. Калядоўшчыкі былі артыстамі асаблівага роду, бо ў іх абавязкі ўваходзіла забаўляць і пацяшаць народ. Акрамя распрацоўкі "сцэнарыя" ваджэння Казы, неабходна было дасканальна прадумаць касцюмы персанажаў і іх маскі. Вядомы розныя спосабы і прыёмы пераапранання Казы. Найбольш просты заключаўся ў тым, што "хлопец-выканаўца накідваў на сябе вывернуты шэрсцю наверх кажух і станавіўся на карачкі". Захавалася апісанне касцюма і маскі Казы, зробленае А.К.Кіркорам: "Малады хлопец апранае шарсцяную белую кашулю, да варатніка якой прышывае галаву казы, з мордай і рожкамі. Бывае, што галава гэтая зроблена даволі ўмела, з якога-небудзь пучка, а морда з дзвюх драўляных пласцінак, пакрытых шэрсцю, пад якую праведзена вяроўка, так што той, хто прадстаўляе казу, непрыкметна тузаючы вяроўку, застаўляе пласцінкі шчоўкаць, і гледачам можа паказацца, што каза шчоўкае зубамі". Часам маску "майстравалі з дрэва, самым старанным чынам абклейвалі скурамі, а рогі рабілі не з саломы або сталовых лыжак, а прымацоўвалі сапраўдныя (ад забітай казы)". Больш таго, "ніжнюю частку маскі стараліся зрабіць рухавай. Выканаўца тузаў прывязаную да яе вяровачку — сківіца варушылася і стваралася ўражанне сапраўды жуючай казы". Павадыром Казы быў Дзед. Хлопцу, які выконваў гэтую ролю, прывязвалі ільняную бараду, на спіне майстравалі горб, на галаву надзявалі каўпак з бярозавай кары, а твар вымазвалі сажай.

Паступова першапачатковы сюжэт дзеі пачаў адыходзіць ад свайго песеннага аналага. Пашырылася кола дзеючых персанажаў. Так, акрамя Дзеда, з'явіліся Баба, Цыган, Турак, Лекар, Казак, Яўрэй і інш. Усе яны мелі адпаведны калядначу настрою знешні выгляд, і вось такі "маскарад" хадзіў па вёсцы з хаты ў хату і пацяшаў сялян. Аднак, як лічыў І.Эрэміч, найбольш папулярным з усіх маскарадных персанажаў, якія прымалі ўдзел у калядных прадстаўленнях, была Каза. Акрамя Казы-маскі, у калядных абходах магла прымаць удзел і жывая каза, а здаралася, і жывы мядзведзь. Аднак выступалі яны заўжды асобна адзін ад аднаго. Як адзначае А.Ф.Някрылава, найбольш камічнай была сітуацыя, у якой былі прадстаўлены сапраўдны мядзведзь і пераапрануты ў Казу чалавек: жывёла (мядзведзь) імітавала дзеянні людзей, а чалавек (Каза) прадстаўляў жывёлу. Кожны рабіў не сваю справу, памяняўшыся месцамі адзін з адным, ствараючы святочную смяхотную атмасферу, дзе ўсё не так, усё наадварот і таму смешна. Традыцыя пераапранацца Казой была ўласціва не толькі славянскім народам, але і народам Закаўказзя і Еўропы.

Непасрэдна з каляднай Казой звязаны батлеечны персанаж са сцэны "Антон з казой і Антоніха". Захавалася шмат запісаў гэтай сцэны, дзякуючы якім можна з адноснай доляй дакладнасці ўявіць, якой была гэтая незвычайная ўдзельніца прадстаўлення ў беларускай батлейцы. Сцэна гэта прадстаўлена наступным чынам:

*З'яўляецца мужык. Ён вядзе казу. Следам ідзе баба*

Хор (спявае)
Антон казу вядзець,
Антоніха падганяіць,
Каза бубкі раняіць,
Антоніха поднімаіць.
Не папала па казе, —
Да па Антонавай назе.
Антон плачыць,
Антоніха скачыць!

Каза тут цалкам адпавядае свайму характару. Бо ўсё, што адбываецца ў гэтай сцэне камічнага, становіцца смешным дзякуючы ёй. Так ужо склалася, што спрадвеку казе прыпісвалі неверагодную ўпартасць і свавольнасць, і гэтыя якасці ў поўнай меры абыгрываюцца ў батлеечным прадстаўленні. Камічная і па-свойму буфонная сітуацыя: раняе "бубкі" Каза, і пакутуюць пры гэтым ногі Антона.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У другім запісе змяняецца характар “адносін” Антона з Казой: ён пачынае вучыць яе розуму — лупіць, а яна — ні з месца...

Антон казу б’ець,
А каза не йдзець.

Сітуацыя, здавалася, бязвыхадная, але Антон — мужык кемлівы, ён ведае, як прымусіць Казу рухацца. Спосаб такі ж буфонны: “У Антона ў руках лучына. Ён запальвае яе і падносіць казе пад хвост, а самі з Антоніхай высковаюць з вяртэпа”.

У тэксце батлеечнага прадстаўлення на Міншчыне на сцэну Антон выходзіць з Казой, а Антоніха — з даёнкай. Пры гэтым спяваюцца наступныя куплеты:

Антон казу вядзе,
Тыц, мыц, каза не йдзе:
Антоніха паганяе,
На табаку зарабляе.

***

Антон па табаку,
Яго лаюць, як сабаку.
Антоніха па муку,
Яе лаюць, як суку.

***

А ты, каза, стой! Стой!
*(Антоніха пачынае даіць казу)*
А я казу — дой, дой!
А я казу кулаком,
Ідзі сабе з малаком.
А пазвольце ж Антонему
Зрабіць усё па-сваему.

***

Мая каза белая
Па гародзе бегае:
Аб’елася часнаку,
Крычыць, бяжыць па таку.

***

Мая ж каза казілася
І з прыпечку звалілася.
Мяне дома не было,
Маю казу абдуло

***

Антон малодзенькі
Піў мёд салодзенькі,
Прыкаціўся к бочаццы,
Яму яшчэ хочацца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да ўсіх малапрыемных якасцей тут Казе батлеечнікамі дадаецца і нейкая “разумовая абмежаванасць”, з-за якой ёй даводзіцца пакутаваць “страўнікам” і адбітымі бакамі. Мала таго, што яна сама з-за ўпартасці стварае для сябе даволі экстрэмальныя ўмовы (за што і бывае пакараная), дык яшчэ і Антоніха выхоўвае яе “народным інструментам” — кулаком: у дадзенай сітуацыі Казе не пазайздросціш, але глядач застаецца задаволены сюжэтам: Каза і яе гаспадары вартыя адзін аднаго.

У другім варыянце Мінскай батлейкі Каза традыцыйна адмаўляецца ісці, і, пакуль Антоніха займаецца прыгатаваннем масла, Антон вырашыў, раз няма каня, асядлаць Казу, што ён і робіць, прыгаворваючы:

Каб цябе ваўкі з’елі
У Камароўскім балоце.

Фінал сцэны чыста балаганны: Каза, якой падпалілі хвост, з бляяннем, грукатам, іскрамі і дымам знікае з ездаком — Антонам — за кулісамі.

У Навагрудскай батлейцы пачатак сцэны традыцыйны:

Х о р (спявае):

Антон казу вядзе, трац-муц,
Каза не йдзе — труц-муц,
Антон упінаецца,
Каза яму не даецца.

Але звыклы сцэнарый змяняецца. Антон, якому выбрыкі Казы абрыдлі, вырашае ўпартую Казу прадаць. І тут, па законах тэатра, дарэчы трапляецца Янкель, адзін з нямногіх персанажаў батлейкі, які заўжды ў стане набыць усё прапанаванае, як і прадаць усё непатрэбнае. Аднак, як бывалы гандляр, Янкель патрабуе дазволу агледзець, “памацаць” тавар. На задавальненне гледачам Каза дэманструе сваю сапраўдную сутнасць — гоніць Янкеля рагамі са сцэны. Антон засмучаны, ён ідзе шукаць другога пакупніка.

Больш сюжэтна закончана гэтая сцэна ў другім варыянце Навагрудскай батлейкі. Тут яўна паказана, што збыць з рук Казу — справа нялёгкая і няхуткая. У пацвярджэнне гэтага Антон кажа:

Вадзіў я цябе па Стаўпішчы
І па Гарадзішчы,
Прывёў на Міколу да Міра,
Ці не дасць бог купца якога,
Галёндара...

На шчасце Антона з'яўляецца Ёсель з традыцыйным для гэтага персанажа пытаннем: "А што ты хочаш за яму?" Кошт у тры талеры і паўкварты гарэлкі задавальняе галёндара, але тавар агледзець трэба б... Антон не вельмі ласкава ("Штурхай, няхай цябе хвароба бурхае..."), але дазваляе "паштурхаць" Казу. І вось тут кульмінацыя сцэны: лялечная Каза паводзіць сябе так, як павінна весці сябе на сцэне, яна ўжо "зброя пакарання", і, да захаплення гледачоў, "яна б'е рагамі яму пад бакі", гоніць са сцэны, а Ёсель лемантуе: "Антон, Антон, ліха матары! Каза мне два рэбры выбіла, прымі сваю казу...". Што застаецца рабіць Антону, дык толькі пагражаць Казе: "Вось упрагу цябе я ў баляскі ды насцёбаю!"

Здаецца, такі персанаж, як Каза, з'явіўся ў батлейцы выключна для стварэння камічных сітуацый, аднак, памятаючы неадназначныя адносіны да гэтага вобраза не працягу стагоддзяў, у канкрэтным персанажы бачыцца рэальная алегорыя, якая стварае столькі магчымасцей батлеечнікам для высмейвання або жартоўнага здзеку над чалавечымі недахопамі. Відавочна, што ў вобразе Казы адмоўныя рысы, такія як непаслухмянасць і ўпартасць, глупства і непрадказальнасць паводзін, адлюстраваны найбольш ярка. Хаця тут, як часта бывае ў тэатры, ды і ўвогуле ў мастацтве, адбываецца "ўзасмаабмен характарамі" — метамарфозы: Каза надзяляецца адмоўнымі чалавечымі якасцямі для таго, каб яны ў канчатковым выніку былі высмеяны.

Такім чынам, эвалюцыя персанажа Казы пачалася ў старажытных народных вераваннях як вобразнае рашэнне татэмічнага бажаства. У гэтым гістарычным працэсе Каза прайшла ўвесь шлях трансфармацыі і персаніфікацыі, у выніку чаго доўгі стала традыцыйным персанажам беларускай батлейкі. Пры гэтым яна набыла індывідуальную і нацыянальную афарбоўку, стала тыповым карнавальным персанажам і ўжо не мела нічога агульнага са сваімі папярэднімі вобразнымі ўвасабленнямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ